# СТАНАЎЛЕННЕ ШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ЗАНАРАЦКАЙ ВОЛАСЦІ СВЯНЦЯНСКАГА ЎЕЗДА ВІЛЕНСКАЙ ГУБЕРНІІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**І. А. Дабралет**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*igor.dobrolet.98@bk.ru;*
*нав. кір.: В. І. Яршова – канд. гіст. навук, дац.*

Анатацыя. Артыкул прысвечаны гісторыі станаўлення пачатковай адукацыі ў аг. Занарач у другой палове XIX – пачатку XX ст. Шэраг лічбавых паказчыкаў разглядаюцца ў дынаміцы: колькасць вучняў, працягласць працы настаўнікаў, выдаткі на ўтрыманне школы і інш. Матэрыялы артыкула цікавыя ў тым сэнсе, што ўпершыню станаўленне навучальнага працэсу ў аг. Занарач разглядаецца з пазіцый гісторыі адукацыі і рэканструіравана на выснове гістарычных крыніц.

***Ключавыя словы:*** Занарачскае народнае вучылішча; вясковы настаўнік; законавучыцель; Віленская навучальная акруга, пачатковая адукацыя.

У другой палове XIX ст. в. Занарач і в. Блізнікі (у 1960 г. апошнюю далучылі да в. Занарач) уваходзілі ў Віленскую навучальную акругу. Занарацкая воласць адносілася да IV Міравога ўчастка Свянцянскага павета.




Занарач на мапе 1874 года

У 1859 г. духавенства Літоўскай епархіі вырашала пытанне аб стварэнні школ для пасяленскіх дзяцей. Трохі больш, чым за тры гады, у Гродзенскай і Віленскай губернях было адчынена 323 вучылішчы, з якіх 245 утрымлівалася самім духавенствам. У гэты лік уваходзіла і Занарацкае вучылішча, адчыненае ў 1863 г. У 1864 г. адкрыцце школы было афіцыйна замацавана. Навучальная ўстанова размясцілася ў

сялянскай хаце. У 1863 г. вучыцца пажадалі 11 хлопчыкаў [1, с. 295–296]. У 1864 г. вучыцца прыйшлі ўжо 22 хлопчыкі праваслаўнага вызнання [2, с. 30]. Першым выкладчыкам стаў Іаан Чэрнякевіч.

З сакавіка 1863 г. дзейнасць пачатковых навучальных устаноў Віленскай навучальнай акругі абумоўлівалася «Часовымі правіламі для пачатковых школ», якія прадугледжвалі значная адрозненні ад губерній Еўрапейскай Расіі па пытаннях адкрыцця школ, кіравання імі, фінансавання і г.д. Большасць школ Віленскай і Гродненскай губерній, заснаваных у 1860-х гг., лічылася штатнымі – іншымі словамі, яны атрымоўвалі грошы з Дзяржаўнага казначэйства. Гэта было звязана з рэлігійным і этнічным складам насельніцтва дадзеных губерній, дзе пражывала шмат каталікоў, польская мова мела трывалыя пазіцыі. Рускі ўрад імкнуўся паслабіць тут польска-каталіцкі ўплыў з дапамогай праўрадавай пачатковай адукацыі з рускай мовай выкладання. Наадварот, школы Віцебскай і Магілеўскай губерній, дзе пражывала шмат праваслаўных, атрымоўвалі меньш казенных сродкаў. [3, с. 23] Занарацкае вучылішча лічылася штатным, яму выдзялялася 200 руб. ў год з Дзяржаўнай казны [4, с. 96]. На будаўніцтва уласнага памяшкання не было грошай, таму дзеці працягвалі вучыцца ў нязручным для заняткаў памяшканні [4, с. 96]. Вучылішча з'яўлялася аднакласным з трохгадовым срокам навучання. Праграмма прадугледжвала заняткі па чатырох прадметах: арыфметыке, чытанню, пісьму і Закону Божаму.

У 1868 г. новым настаўнікам Занарацкага штатнага вучылішча становіцца Мікалай Кухта. Мясцовага святара і заснавальніка школы Іаана Чэрнікевіча духоўнае кіраўніцтва перамясціла ў Кавальскую царкву Дзісненскага павета [5, с. 9]. Ен, як высветлілася, імкнуўся умацаваць свой уплыў на прыхажан, распаўсюджваў недавер і непавагу да мясцовых міравых устаноў [6, с. 459]. Колькасць навучэнцаў у 1869 г. узрастае да 63 чалавек, з іх 3 дзяўчынкі [5, с. 60]. Большая частка пачатковых вучылішч на тэрыторыі Беларусі, як і Занарацкае, з'ўляліся змешанымі па тыпу – там вучыліся і хлопчыкі, і дзяўчынкі.

У верасні 1873 г. настаўнікам вучылішча становіцца Мікалай Флегантовіч Авесаломаў. Як і большасць вясковых настаўнікаў Віленскай навучальнай акругі, ен скончыў духоўную семінарыю. Мясцовае вясковае грамадства выдзеліла яму кватэру і зарплату ў 150 руб. Пасля атрымання ў 1877 г. звання гарадскога прыхадскога настаўніка Авесаломаву пачалі даплачваць да асноўнага заробку прыварачных 48 руб. і хлеба на 43 руб. [7, с. 36]. Закон Божы павінен быў выкладаць законавучыцель – звычайна, гэта мясцовы праваслаўны святар. У 1872 г. новым святаром Занарацкай царквы прызначылі Мікалая Беланцава. Ен меў сярэднюю духоўную адукацыю (скончыў

Літоўскую духоўную семінарыю) і атрымліваў за выкладанне ў школе 25 руб. у год [8, с. 158]. З 1875 г. законавучыцелем з'яўляецца святар Грыгорый Іванавіч Грыгаровіч, таксама выпускнік Літоўскай духоўнай семінарыі [9, с. 29]. У 1879 г. яго змяніў Пётр Феадоравіч Арлоў [10, с. 62].

У 1883 г. у Занарацкай воласці ўпершыню з'явіўся настаўнік, атрымаўшы спецыяльную прафесійную адукацыю. Сев. Талайка скончыў першую ў Расійскай імперыі настаўніцкую семінарыю – ў Маладзечна. Ен атрымоўваў за сваю працу 150 руб. і прыварачных 48 руб. у год. Вясковае грамадства выдзеліла яму кватэру і адну дзесяціну зямлі. Занарацкае вучылішча ў той час наведвала 56 хлопчыкаў і адна дзяўчынка. [11, с. 66]

Праз тры гады Сев. Талайку змяніў Ів. Чабань, які таксама скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. Ен працаваў настаўнікам у в. Занарач 11 год. Закон Божы ў гэты періяд выкладаў святар Лавр Сахараў. [12, с. 12]

Пасля 1897 г. у Занарацкім вучылішчы пачалі часта змяняцца настаўнікі. У 1897-1899 г. працаваў чарговы выпускнік Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі Сергій Стасуй. Ен вучыў 75 хлопчыкаў. З 1899 па 1905 г. у вучылішчы выкладае Яўген Жарскі, пасля – С. Крывенькі [13, с. 40].

У 1890-х гг. Занарацкае вучылішча, якое падпарадкоўвалася Міністэрству народнай асветы, вымушана канкуравала з адчыненым у 1893 г. царкоўна-прыхадскім вучылішчам, знаходзячымся ў веданні Св. Сінода. Пры школе з'явіўся інтэрнат – для вучняў, якія пражывалі далека, пасцельныя рэчы дзеці прыносілі з сабой. Школе вясковае грамадства выдзеліла дзесяціну зямлі, на якой пасадзілі вялікі сад, стварылі агарод. Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні даглядалі дрэвы, вырошчвалі гародніну [14, с. 17]. За дадатковыя заняткі з вучнямі па садоўніцтву і агародніцтву С. Крывенькі атрымліваў даплату ў 12 руб. Столькі ж грошаў вучылішча атрымоўвала ад казны на куплю садовых інструментаў [15, с. 4].

У 1915 г., у час Першай сусветнай вайны, школа была разбурана. Навучанне аднавілася толькі ў пасляваенныя гады, але яно праходзіла ўжо на польскай мове, па сялянскіх хатах.

Такім чынам, Занарацкае аднакласнае народнае вучылішча Міністэрства народный асветы з'яўлялася прыкладам найбольш распаўсюджанага тыпу пачатковай школы на тэрыторыі Віленскай навучальнай акругі ў другой палове XIX ст. Адачасова яно ўнікальна, таму што ўваходзіла ў лік першых урадавых вучылішч 1862–1863 года адкрыцця і існуе да нашых дзен.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Литовские епархиальные ведомости. 1863. № 9 С. 281-316.
2. Отчет по управлению Виленской дирекцией народных училищ за 1864 гражданский год. Вильно, 1865. 50 с.
3. *Ершова О. И.* Тенденции развития начального народного образования в Витебской губернии в 1860-х гг. // Адукацыя на Віцебшчыне: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 30–31 сакавіка 2010 г. / рэдкал.: В.У. Акуневіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2010.
4. Отчет по управлению Виленской дирекцией народных училищ за 1865 гражданский год. Вильно, 1866. 161 с.
5. Отчет по управлению Виленской дирекцией народных училищ за 1868 гражданский год. Вильно, 1869. 74 с.
6. Литовские епархиальные ведомости. 1869. № 8. С. 457-540.
7. *П*амятная книжка Виленского учебного округа на 1877 год : [в 2 ч.]. Вильно, 1877. 408 с.
8. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1874 год. Вильно, 1874. 681 с.
9. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1876 год : [в 2 ч.]. Вильно, 1876. 192 с.
10. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1883-1884 учебный год. Ч. 1. 1884. 151 с.
11. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1884-1885 учебный год. Ч. 1. 1885. 151 с.
12. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1888-1889 учебный год. Ч. 2. 1889. 248 с.
13. Памятная книжка Виленского учебного округа на 1900-1901 учебный год. Ч. 2. 1901. 320 с.
14. Занарочский сельсовет: местная повестка на XXI век. Минск : Новапринт, 2007. 50 с.
15. Народное образование в Виленском учебном округе: приложение к Циркуляру по Виленскому учебному округу. Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1905. № 6. 5 с.